**Медведева Г. Б.,** кандидат экономических наук, доцент (учреждение образования «Брестский государственный технический университет», Брест, Республика Беларусь); **Нечухрин А. Н.,** доктор исторических наук, профессор (учреждение образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы», Гродно, Республика Беларусь); **Омельянюк А. М.,** кандидат экономических наук, доцент (учреждение образования «Брестский государственный технический университет», Брест, Республика Беларусь); **Познякевич В. Н.,** кандидат экономических наук, доцент (учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь); **Посохина Г. И.,** кандидат исторических наук, доцент (учреждение образования «Брестский государственный университет имени А. С. Пушкина», Брест, Республика Беларусь); **Рябова К. И.,** кандидат экономических наук, доцент (учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь); **Солодовников С. Ю.,** доктор экономических наук, профессор (Белорусский национальный технический университет, Минск, Республика Беларусь); **Таранова Т. С.,** доктор юридических наук, профессор (учреждение образования «Белорусский государственный экономический университет», Минск, Республика Беларусь); **Функ Я. И.,** доктор юридических наук, профессор (Белорусский государственный университет, Минск, Республика Беларусь); **Шабанов В. Б.,** доктор юридических наук, профессор (Белорусский государственный университет, Минск, Республика Беларусь); **Шевлюков А. П.,** доктор экономических наук, профессор (учреждение образования «Белорусский торгово-экономический университет потребительской кооперации», Гомель, Республика Беларусь); **Яковчик Н. С.,** доктор экономических наук, доктор сельскохозяйственных наук, профессор, заслуженный работник сельского хозяйства Республики Беларусь (Институт повышения квалификации и переподготовки кадров агропромышленного комплекса учреждения образования «Белорусский государственный аграрный технический университет», Минск, Республика Беларусь).

**МЕЖДУНАРОДНЫЙ РЕДАКЦИОННЫЙ СОВЕТ СЕРИИ**

**Андреева О. В.,** кандидат экономических наук, доцент (Центр стратегических исследований социально-экономического развития Юга России РГЭУ (РИНХ), Ростов-на-Дону, Российская Федерация); **Астратова Г. В.,** доктор экономических наук, кандидат технических наук, профессор, почетный работник высшего профессионального образования Российской Федерации (Уральский федеральный университет имени первого Президента России Б. Н. Ельцина, Екатеринбург, Российская Федерация); **Белянская О. В.,** кандидат юридических наук, доцент (Институт права и национальной безопасности федерального государственного бюджетного образовательного учреждения высшего образования «Тамбовский государственный университет имени Г. Р. Державина», Тамбов, Российская Федерация); **Биглова Г. Ф.,** доктор экономических наук, доцент (Институт социально-экономических исследований федерального государственного бюджетного научного учреждения «Уфимский федеральный исследовательский центр Российской академии наук», Уфа, Республика Башкортостан, Российская Федерация); **Горбатова М. А.,** кандидат юридических наук, доцент (Санкт-Петербургский институт (филиал) федерального государственного бюджетного образовательного учреждения высшего образования «Всероссийский государственный университет юстиции (РПА Минюста России)», Санкт-Петербург, Российская Федерация); **Закирова Э. Р.,** кандидат экономических наук, доцент (Институт дополнительного образования федерального государственного бюджетного образовательного учреждения высшего образования «Уральский государственный экономический университет», Екатеринбург, Российская Федерация); **Звирбуле А.,** доктор экономических наук, профессор (Латвийский сельскохозяйственный университет, Елгава, Латвийская Республика); **Касич А. А.,** доктор экономических наук, профессор (Киевский национальный университет технологий и дизайна, Киев, Украина); **Кузнецова Ю. А.,** кандидат экономических наук (филиал федерального государственного бюджетного образовательного учреждения высшего образования «Кузбасский государственный технический университет имени Т. Ф. Горбачева» в г. Новокузнецке, Новокузнецк, Российская Федерация); **Момот Т. В.,** доктор экономических наук, профессор (Харьковский национальный университет городского хозяйства имени А. Н. Бекетова, Харьков, Украина); **Одинцова Т. М.,** кандидат экономических наук, доцент (Институт финансов, экономики и управления федерального государственного автономного образовательного учреждения высшего образования «Севастопольский государственный университет», Севастополь, Российская Федерация); **Острогляд А. В.,** кандидат юридических наук, доцент (учреждение высшего образования «Университет Короля Данила», Ивано-Франковск, Украина); **Терзиев В. К.,** доктор наук (экономика), доктор наук (национальная безопасность), доктор наук (социальная деятельность) профессор (Военная академия имени Георгия Раковского, Русенский университет имени Ангела Кънчева, Русе, Болгария); **Шалаев В. П.,** доктор философских наук, профессор (федеральное государственное бюджетное образовательное учреждение высшего профессионального образования «Поволжский государственный технологический университет», Йошкар-Ола, Республика Марий Эл, Российская Федерация); **Шаркова А. В.,** доктор экономических наук, профессор (федеральное государственное образовательное бюджетное учреждение высшего образования «Финансовый университет при Правительстве Российской Федерации», Москва, Российская Федерация).

© БарГУ, 2022

Репозиторий БарГУ

Economics, Associate Professor (Educational institution “Brest State Technical University”, Brest, the Republic of Belarus); **Poznyakevich V. N.,** PhD in Economics, Associate Professor (Educational institution “Baranovichi State University”, Baranovichi, the Republic of Belarus); **Posohina G. I.,** PhD in History, Associate Professor (Educational institution “Brest State A.S. Pushkin University”, Brest, the Republic of Belarus); **Ryabova K. I.,** PhD in Economics, Associate Professor (Educational institution “Baranovichi State University”, Baranovichi, the Republic of Belarus); **Solodovnikov S. Yu.,** Doctor of Economic Sciences, Professor (Educational institution “Belarusian National Technical University”, Minsk, the Republic of Belarus); **Taranova T. S.,** Doctor of Legal Sciences, Professor (Belorussian State Economic University, Minsk, the Republic of Belarus); **Funk Ya. I.,** Doctor of Legal Sciences, Professor (Belarusian State University, Minsk, the Republic of Belarus); **Shabanov V. B.,** Doctor of Legal Sciences, Professor (Belarusian State University, Minsk, the Republic of Belarus); **Shevlyukov A. P.,** Doctor of Economic Sciences, Professor (Educational institution “The Belarusian Trade and Economics University of Consumer Cooperation”, Gomel, the Republic of Belarus); **Yakovchik N. S.,** Doctor of Economic Sciences, Doctor of Agricultural Sciences, Professor, Honored Worker of Agriculture of the Republic of Belarus (Professional Development and Retraining Institute of Agribusiness Specialists of Educational institution “Belarusian State Agrarian Technical University”, Minsk, the Republic of Belarus).

**INTERNATIONAL EDITORIAL BOARD**

**Andreeva O. V.,** PhD in Economics, Associate Professor (the Center for Strategic Studies of Socio-Economic Development of the South of Russia RSUE, Rostov-on-don, Russian Federation); **Astratova G. V.,** Doctor of Economic Sciences, PhD in Technical Sciences, Professor, Honored Worker of High Professional Education of Russian Federation (Ural Federal University named after the first President of Russia B.N. Yeltsin, Yekaterinburg, Russian Federation); **Belyanskaya O. V.,** PhD in Law, Associate Professor (the Institute of Law and National Security of Derzhavin Tambov State University, Tambov, Russian Federation); **Biglova G. F.,** Doctor of Economic Sciences, Associate Professor ( the Institute of Socio-Economic Studies of the Federal State Budgetary Institution of Science “Ufa Federal Research Center of the Russian Academy of Sciences”, Ufa, Bashkortostan, Russian Federation); **Gorbatova M. A.,** PhD in Law, Associate Professor (Saint Petersburg Institute (Branch) of Federal State Budgetary Educational Institution of Higher Education “All-Russian State University (RLA of the Ministry of Justice of Russia”, Saint Petersburg, Russian Federation); **Zakirova E. R.,** PhD in Economics, Associate Professor (the Institute of Continuing Education of the Federal State Budgetary Educational Institution of Higher Education “Ural State Economic University”, Yekaterinburg, Russian Federation); **Zvirbule A.,** Doctor of Economic Sciences, Professor (Latvia University of Agriculture, Jelgava, Republic of Latvia); **Kasich A. A.,** Doctor of Economic Sciences, Professor (Kyiv National University of Technologies and Design, Kyiv, Ukraine); **Kuznetsova Yu. A.,** PhD in Economics (the Branch of the Federal State Budgetary Educational Institution of Higher Education “T. F. Gorbachev Kuzbass State Technical University in Novokuznetsk”, Novokuznetsk, Russian Federation); **Momot T. V.,** Doctor of Economic Sciences, Professor (A.N. Beketov National University of Urban Economy in Kharkiv, Kharkiv, Ukraine); **Odintsova T. M.,** PhD in Economics, Associate Professor (Institute for Finance, Economics and Management of the Federal State Autonomous Educational Institution of Higher Education “Sevastopol State University”, Sevastopol, Russian Federation); **Ostroglyad A. V.,** PhD in Law, Associate Professor (Higher Educational Institution “King Danila University”, Ivano-Frankivsk, Ukraine); **Terziev V. K.,** D.Sc. (Economics), D.Sc. (National Security), D.Sc. (Social Activities), Professor (Military Academy “G. S. Rakovski”, the University of Ruse “Angel Kanchev”, Rousse, Bulgaria); **Shalaev V. P.,** Doctor of Philosophical Sciences, Professor (the Federal State Budgetary Educational Institution of Higher Professional Education “Volga State University of Technology”, Yoshkar-Ola, the Mari El Republic, Russian Federation); **Sharkova A. V.,** Doctor of Economic Sciences, Professor (the Federal State Educational Budgetary Institution of Higher Education “Financial University under the Government of the Russian Federation”, Moscow, Russian Federation).

© BarSU, 2022

Репозиторий БарГУ

## СОДЕРЖАНИЕ

### ИСТОРИЧЕСКИЕ НАУКИ И АРХЕОЛОГИЯ

**Булатая В. Ю.** Адлюстраванне і ацэнка падзей адраджэння царкоўнай уніі ў матэрыялах газеты “Krynica” (“Białoruskaja Krynica”) у міжваенны перыяд — 6

**Елизаров С. А.** Председатели местных исполкомов БССР 1953—1964 годов: основные тенденции, качественный и количественный состав — 11

**Ермаковіч Л. І.** Праваслаўныя брацтвы на Беларусі — 18

**Посохина Г. И.** Новые направления в идеологии коммунистической партии Китая в эпоху проведения политики реформ и открытости — 26

**Смірноў С. М.** Рэлігійная палітыка Аляксандра Севера: традыцыя і сінкрэтызм — 33

**Стукачева Ю. Ю.** Методологические изменения в американской исторической науке в 1970—1980-х годах — 38

### ЭКОНОМИЧЕСКИЕ НАУКИ

**Гуторова Е. В.** Территориальная мобильность рабочей силы: сущность, классификация, особенности в Республике Беларусь — 44

**Климук В. В.** Оценка эффективности развития инновационной инфраструктуры Республики Беларусь в векторе наукоемкой экономики — 54

**Лабейко О. А., Скидан К. Н.** Теоретико-методические аспекты государственного регулирования рынка труда — 62

### ЮРИДИЧЕСКИЕ НАУКИ

**Василевич Г. А.** Развитие конституционно-правового статуса человека и гражданина в контексте изменений и дополнений Конституции по итогам референдума 2022 года — 67

**Людвикевич О. Н.** Внештатное сотрудничество в контексте реализации концепции юридического образования — 72

**Чмыга О. В.** Право на запрос, предложения и замечания, обращение депутата местного Совета как значимый инструмент местной коллегиальной представительной демократии — 77

**Шуленкова И. В., Ворошкевич С. А.** Уголовно-правовая характеристика контрабанды как опасного таможенного преступления — 83

## CONTENTS

### HISTORICAL SCIENCES AND ARCHAEOLOGY

6 **Bulataja V.** Reflection and evaluation of the events of the revival of the church union in the materials of the newspaper “Krynica” (“Białoruskaja Krynica”) in the interwar period

11 **Elizarov S. A.** Chairmen of local executive committees of the BSSR 1953—1964: main trends, qualitative and quantitative composition

18 **Ermakovich L. I.** Orthodox brotherhoods in Belarus

26 **Posokhina G. I.** New directions in the ideology of the communist party of China during the period of the reform and opening-up policy

33 **Smirnou S. M.** Religious politics of Alexander Severus: tradition and syncretism

38 **Stukacheva Y. Y.** Methodological changes in american historical science in the 1970—1980s

### ECONOMICS

44 **Gutorova A. V.** Territorial mobility of the labor force: essence, classification, features in the Republic of Belarus

54 **Klimuk V. V.** Assessment of the effectiveness of the development of innovation infrastructure of the Republic of Belarus in the vector of knowledge-intensive economy

62 **Labeyko O. A., Skidan K. N.** Theoretical and methodological aspects of state regulation of the labor market

### LAW

67 **Vasilevich G. A.** The development of the constitutional and legal status of a person and a citizen in the context of amendments and additions to the Constitution following the results of the 2022 referendum

72 **Lyudvikevich V. N.** Non-staff cooperation in the context of realization the concept of the legal education

77 **Chmyga O. V.** Right to request, suggestions and comments, appeal of local Council deputy as a significant instrument of local collegiate representative democracy

83 **Shulenkova I. V., Voroshkevich S. A.** Criminal and legal characteristics of smuggling as a dangerous customs crime

Репозиторий БарГУ

УДК 271.2(476)

**Л. І. Ермаковіч,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт
Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», вул. Войкава, 21,
225404 Баранавічы, Рэспубліка Беларусь, +375 (29) 182 47 45, leonid.ermakovich@bk.ru

# ПРАВАСЛАЎНЫЯ БРАЦТВЫ НА БЕЛАРУСІ

У артыкуле разглядаецца дзейнасць праваслаўных брацтваў на тэрыторыі Беларусі ў XVI — пачатку XX стагоддзя. На канкрэтным гістарычным фоне высвятляюцца прычыны іх узнікнення, сацыяльны склад, арганізацыйная структура, мэты, накірункі дзейнасці і іх змест. Асаблівы акцэнт зроблены на асвятленне і аналіз адукацыйнай дзейнасці праваслаўных брацтваў як галоўнага сродка павышэння царкоўна-рэлігійнай культуры праваслаўнага святарства і праваслаўнай паствы, тэалагічнай распрацоўкі і абгрунтавання хрысціянскага веравучэння ў яго праваслаўнай форме, супрацьстаяння ідэалагічнаму наступу на праваслаўную веру з боку Рымска-каталіцкай і ўніяцкай царквы, што дазволіла беларускаму народу пазбегнуць дэнацыяналізацыі і працягваць сваё існаванне ў геаграфічнай і гістарычнай прасторы. Высвятляюцца прычыны заняпаду праваслаўных брацтваў у XVIII стагоддзі і іх адраджэння ў апошняй трэці XIX стагоддзя. Разглядаюцца асаблівасці дзейнасці брацтваў у апошні перыяд іх існавання.

**Ключавыя словы:** праваслаўе; святарства; праваслаўныя брацтвы; братчыкі; брацкія школы; каталіцтва; езуіты; уніяцтва.
Бібліягр.: 10 назв.

**L. I. Ermakovich,** PhD in History, Associate Professor
Educational institution "Baranovichi State University", 21 Voikova Str., 225404 Baranovichi, the Republic of Belarus, +375 (29) 182 47 45, leonid.ermakovich@bk.ru

# ORTHODOX BROTHERHOODS IN BELARUS

The article deals with the activities of Orthodox brotherhoods in Belarus in the XVI — early XX centuries. The causes of their occurrence, social composition, organizational structure, goals and directions of their activities and their content are revealed in a specific historical context. Particular emphasis has been placed on the review and analysis of the educational activities of the Orthodox brotherhoods as the main means of increasing the church and religious culture of the Orthodox priesthood and the Orthodox flock, the theoretical development and justification of the Christian dogma in its Orthodox form, and opposition to the ideological attack on the Orthodox faith by the Roman Catholic and Uniate Church, that allowed the Belarusian people to avoid denationalization and continue their existence in the geographical and historical space. The reasons for the decline of Orthodox brotherhoods in the XVIII century and their revival in the last third of the XIX century are explained. The features of the activities of the brotherhoods in the last period of their existence are considered.

**Key words:** Orthodoxy; priesthood; Orthodox brotherhoods; brotherhood members; brotherhood schools; Catholicism; the Jesuits; the Greek-Catholic Church.
Ref.: 10 titles.

**Уводзіны.** У жыцці кожнага народа адбываюцца падзеі, якія прадвызначаюць шлях яго гістарычнага развіцця, закладваюць матрыцу яго духоўнага вобліку, асаблівасці светаразумення і самаўспрымання. Адной з такіх эпахальных падзей у гісторыі беларускага народа стаў пераход ад паганскай да хрысціянскай веры ў праваслаўнай форме, які суправаджаўся глыбокімі зрухамі ў духоўным жыцці і іншых сферах жыцця грамадства — сацыяльнай, палітычнай, эканамічнай.

Аднак, пачынаючы з канца XIV стагоддзя, у сувязі з унутры- і знешнепалітычнымі абставінамі, аб якіх гаворка пойдзе ніжэй, адбываецца паступовы і няўхільны працэс перафармаціравання духоўнага жыцця беларускага народа на аснове прымусовага насаджэння рымска-

© Ермаковіч Л. І., 2022



Репозиторий БарГУ

каталіцкай, а з другой паловы XVI стагоддзя — і ўніяцкай (грэка-каталіцкай) веры. Гэта вымушала праваслаўных вернікаў да арганізацыйнага згуртавання як для самападтрымкі і ўзмацнення ўпэўненасці ў сваіх поглядах і сілах, так і для больш паспяховага пераадолення супраціву апанентаў з каталіцкага і ўніяцкага лагераў.

Важнейшай арганізацыйнай формай яднання прыхільнікаў праваслаўя дзеля захавання сваёй рэлігійнай і этнічнай ідэнтычнасці, акрамя непасрэдна афіцыйнай царкоўнай іерархіі, сталі праваслаўныя брацтвы, чыя дзейнасць мела шматгранны характар і свае адметныя асаблівасці ў розныя гістарычныя перыяды. Аднак гэта дзейнасць з улікам канкрэтна-гістарычных абставін даследавана яшчэ недастаткова. Аўтар дадзенага артыкула паставіў задачу ў некаторай ступені запоўніць адзначаны прабел.

**Матэрыялы і метады даследавання.** Матэрыялам даследавання выступаюць дакументальныя крыніцы, якія рэгламентавалі рознабаковую дзейнасць праваслаўных брацтваў у розныя гістарычныя перыяды, а таксама навуковая літаратура ў кантэксце разглядаемай праблематыкі. Метадалагічную аснову даследавання складае дыялектычная тэорыя пазнання і заснаваныя на ёй агульнанавуковыя і прыватна-навуковыя метады даследавання: гістарычны, фармальна-лагічны, сістэмнага і комплекснага аналізу.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Прычыны ўзнікнення і дзейнасць праваслаўных брацтваў нельга раглядаць без уліку гістарычнага кантэксту, якому ў розныя часы былі ўласцівы пэўныя палітычныя, сацыяльныя-эканамічныя і культурныя асаблівасці. Правобразам будучых брацтваў, якія з’явіліся на Беларусі ў XVI стагоддзі, стала братчына ў г. Полацку, вядомая з 1159 года, і віленскія мядовыя брацтвы, якія сыцілі мёд (гатавалі мядовыя напоі да рэлігійных святаў), апекавалі бедных, хворых, удоў, сірот і ўбогіх, клапаціліся аб убранні царквы [1, с. 110]. Такім чынам, дзейнасць братчын першапачаткова мела пераважна дабрачынны характар і з’яўлялася адлюстраваннем і працягам старажытных традыцый узаемаспагадлівых адносін нашых продкаў, якія сфарміраваліся пад уплывам суровых прыродных, сацыяльных і штодзённых жыццёвых абставін. Але гэтыя старажытныя традыцыі ў XII стагоддзі атрымалі ўпершыню ідэалагічнае абгрунтаванне з пазіцыі хрысціянскага веравучэння. Важную ролю ў гэтых адносінах адыграла падзвіжніцкая дзейнасць выбітных рэлігійных дзеячаў і асветнікаў Е. Полацкай, К. Тураўскага, К. Смаляціча, А. Смаленскага.

Пераважна дабрачынны характар дзейнасці быў уласцівы праваслаўным братчынам і брацтвам да другой паловы XVI стагоддзя. Гэтаму спрыялі гістарычныя ўмовы іх існавання: дамінаванне праваслаўнай веры на беларускіх землях, эвалюцыя і пераемнасць грамадскіх формаў жыцця на аснове старажытнага абшчыннага ўкладу і калектывісцкіх пачаткаў, прабеларуская сутнасць новага этапу дзяржаўнасці, увасобленага ў Вялікім княстве Літоўскім, Рускім, Жамойцкім (далей — ВКЛ). У такіх сацыяльных і гістарычных умовах брацтвы з’яўляліся формай духоўнага яднання і самакіравання праваслаўных вернікаў, сродкам практычнай рэалізацыі імі сваёй хрысціянскай духоўнасці ў інтарэсах усіх сваіх братоў — хрысціян.

Хто быў ініцыятарам стварэння першых братчын, а затым і брацтваў — дакладна невядома. Але можна з упэўненасцю меркаваць, што ў першую чаргу гэта былі прадстаўнікі святарства, таксама найбольш прасунутыя ў інтэлектуальным і маральным плане праваслаўныя вернікі. Можна таксама сцвярджаць, што іх стваральнікамі былі людзі адукаваныя і самаадукаваныя, якія валодалі асновамі хрысціянскага веравучэння, здольныя ўпэўніць у сваіх поглядах непісьменную людскую масу. Атрымаць адукацыю і мець магчымасці для самаадукацыі можна было ў XII—XVI стагоддзях толькі ў гарадах, якія з’яўляліся не толькі цэнтрамі рамеснай і гандлёвай дзейнасці, але і асяродкамі культурнага жыцця і асветы. Нездарма брацтвы першапачаткова і ў наступныя часы ўзнікалі і дзейнічалі ў гарадах і складаліся пераважна з прадстаўнікоў гарадскога насельніцтва — рамеснікаў і гандляроў.

Напрыканцы XIV стагоддзя ў ВКЛ адбываюцца падзеі, якія садзейнічалі істотным зменам у грамадска-палітычным жыцці. У 1385 годзе паміж ВКЛ і Польшчай была заключана дынастыч-



Рэпазітарый БарДУ

ная Крэўская унія, якая прывяла да пашырэння ў беларуска-літоўскім гаспадарстве рымска-каталіцкай веры. Аднак спачатку з праваслаўнай у каталіцкую веру перайшла толькі частка вышэйшага феадальнага саслоўя, а сялянскае саслоўе і гарадское насельніцтва гэты працэс увогуле не закрануў. Не адбіўся адмоўна гэты працэс спачатку і на становішчы Праваслаўнай царквы.

Паступова, у выніку падтрымкі дзяржаўнага кіраўніцтва каталіцкая вера набывае ўсё большы ўплыў у ВКЛ, што падрывала пануючае становішча ў ім Праваслаўнай царквы. Галоўнай прычынай гэтай з'явы было складанае знешнепалітычнае становішча ВКЛ, якое дыктавала неабходнасць шчыльнага ваенна-палітычнага саюза ВКЛ з каталіцкай Польшчай у сувязі з дзвюма пагрозамі яго суверэнітэту і незалежнасці: з боку Тэўтонскага ордэна з захаду і праваслаўнай Маскоўска-Рускай дзяржавы з усходу, якая выкарыстоўвала рэлігійны фактар для ўмяшання ва ўнутраныя справы ВКЛ і абгрунтавання сваёй захопніцкай палітыкі ў адносінах да беларускіх зямель.

Канец XV — сярэдзіна XVI стагоддзя прайшлі ў амаль бесперапынных войнах Маскоўска-Рускай дзяржавы з ВКЛ, якія значна аслабілі княства. У 1558 годзе маскоўскі цар Іван IV Жахлівы развязаў Лівонскую вайну, якая паставіла ВКЛ на мяжу страты свайго суверэнітэту і прымусіла яго пайсці ў 1569 годзе на заключэнне з Польшчай Люблінскай уніі, паводле якой утварылася федэратыўная дзяржава палякаў і ліцьвінаў (тагачасная назва беларусаў) — Рэч Паспалітая.

Паводле адной з умоў Люблінскай уніі дзяржаўнай рэлігіяй Рэчы Паспалітай абвяшчалася каталіцтва, і толькі феадалы каталіцкага веравызнання маглі займаць дзяржаўныя пасады і надзяляцца рознымі прывілеямі. Дадзеная ўмова спрыяла дэнацыяналізацыі значнай часткі беларускай шляхты і магнатаў, якія ў пагоні за дзяржаўнымі пасадамі і прывілеямі пераходзілі з праваслаўя ў каталіцтва, засвойвалі польскую мову і культуру і тым самым парывалі духоўную повязь са сваім народам. У выніку паступова ўзмацняецца на беларускіх землях і польскі палітычны ўплыў, пашыраюцца формы дзяржаўна-палітычнай арганізацыі грамадства, уласцівыя Польскаму Каралеўству. На гэтым фоне актывізавалі сваю дзейнасць у ВКЛ каталіцкія манаскія ордэны — аўгусцінцаў, францысканцаў, бернардзінцаў і інш. Такі стан рэчаў не мог не адбіцца адмоўна на становішчы Праваслаўнай царквы, якая паступова страчвае манаполію ў справе духоўнага выхавання насельніцтва. Сітуацыя для праваслаўя яшчэ больш ускладнілася тым, што пасля заключэння Люблінскай уніі на Беларусі шырока разгарнуў сваю дзейнасць Ордэн езуітаў — манаскі ордэн Рымска-каталіцкай царквы, які вызначаўся высокім узроўнем тэалагічнай падрыхтоўкі сваіх адэптаў. Езуіты хутка пакрылі тэрыторыю Беларусі сеткай сваіх навучальных устаноў — калегіумаў, якія давалі сярэднюю адукацыю. Першы калегіум быў створаны езуітамі ў сталіцы ВКЛ Вільні ў 1570 годзе. На яго базе езуіты стварылі ў 1579 годзе сваю акадэмію, якая стала першай вышэйшай навучальнай установай у ВКЛ. Езуіцкія навучальныя ўстановы хутка набылі папулярнасць у ВКЛ, бо вызначаліся высокім узроўнем адукацыі, чым прываблівалі да сябе прадстаўнікоў шляхецкага і мяшчанскага саслоўяў.

У плане ўзроўня адукаванасці свайго святарства і вернікаў Праваслаўная царква не вытрымлівала канкурэнцыі з боку Каталіцкай царквы, тым больш што апошняя знаходзілася пад усё ўзрастаючай апекай кіруючых колаў ВКЛ, вымушаных аглядвацца на палітычныя дамоўленасці з каталіцкай Польшчай і талерантныя адносіны да каталіцтва з боку значнай часткі беларускай шляхты і магнатаў.

Становішча Праваслаўнай царквы яшчэ больш ускладнілася ў сувязі з тым, што езуіты пачалі актыўна прапагандаваць у ВКЛ ідэю царкоўнай уніі, зліцця праваслаўя і каталіцтва ў адну веру, якая атрымала назву ўніяцкай, або, па-іншаму, грэка-каталіцкай (грэка-рымскай) веры.

У царкоўнай уніі езуіты і актыўна іх патрымліваючыя польскія феадалы бачылі прамежкавы сродак пераводу з цягам часу ўсяго насельніцтва ВКЛ у каталіцтва, маючы на ўвазе стратэгічную мэту — дэнацыяналізацыю беларусаў і іх апалячванне. Ідэю уніі таксама падтрымлівала частка вышэйшага праваслаўнага святарства ВКЛ, бачачы ў ёй сродак захавання свайго высокага сацыяльнага статуса і набыцця новых прывілеяў. У прыватнасці, гэта датычыцца поглядаў і дзейнасці епіскапа Уладзімірскага і Брэсцкага Іпація Пацея.

Рэпазіторый БарДУ

Неспрыяльныя сацыяльна-палітычныя ўмовы дзейнасці Праваслаўнай царквы, наступ каталіцтва і ўзмацненне праўніяцкіх настрояў у царкоўным асяроддзі прымусілі праваслаўныя брацтвы змяніць галоўны вектар сваей дзейнасці. Калі да Берасцейскай царкоўнай уніі 1596 года іх дзейнасць мела пераважна дабрачынны характар, то з канца XVI стагоддзя галоўным накірункам іх дзейнасці становіцца абарона Праваслаўнай царквы і супрацьдзеянне наступу каталіцкай і ўніяцкай веры. Гэтую дзейнасць ажыццяўлялі як ужо існаваўшыя брацтвы, так і новыя, якія ў значнай колькасці з'явіліся напрыканцы XVI — пачатку XVII стагоддзя. Менавіта стварэннем брацтваў і ўзняццем адукацыі праваслаўнае насельніцтва ВКЛ «стало обнаруживать особенную деятельность к защите своей веры» [2, с. 186].

Важнейшым на тэрыторыі Беларусі было Віленскае брацтва, заснаванае ў 1584 годзе. Акрамя Віленскага напрыканцы XVI — пачатку XVII стагоддзя былі створаны брацтвы Магілёўскае, Бельскае, Мсціслаўскае, Слонімскае Прэабражэнскае, Слуцкае, Крычаўскае, Менскае, Шклоўскае і інш. [2, с. 215]. Ствараліся яны з бласлаўлення патрыярха Канстанцінопальскага Іераміі супраць і царкоўных улад Рэчы Паспалітай. Яны існавалі пераважна ў гарадах і складаліся з прадстаўнікоў мяшчанскага саслоўя — рамеснікаў і гандляроў, а таксама з прадстаўнікоў шляхты і праваслаўнага святарства. Патрэбна асобна падкрэсліць важную ролю буйных феадалаў-магнатаў у справе стварэння брацтваў і забеспячэння іх дзейнасці. Менавіта магнаты аказвалі падтрымку брацтвам сваімі грашыма і абаронай. Да таго ж брацтвы часта ствараліся на ўласных землях магнатаў, што значна абмяжоўвала магчымасці дзяржаўнай улады ўплываць на працэс іх стварэння і дзейнасці. Вялікую дапамогу брацтвам аказвалі беларускія магнацкія роды Алелькавічаў, Сапегаў, Хадкевічаў, Агінскіх, Храптовічаў і інш.

Разам з тым дзяржаўныя ўлады Рэчы Паспалітай усяляк абмяжоўвалі дзейнасць праваслаўных брацтваў, асабліва пасля заключэння Берасцейскай царкоўнай уніі. Ім забаранялася будаваць свае храмы і адкрываць школы. З маўклівай падтрымкі свецкіх улад ужо нам вядомы Іпацій Пацей, які ў 1599 годзе стаў кіеўскім уніяцкім мітрапалітам, у выніку чаго пад яго кіраванне перайшла ўся Праваслаўная царква ВКЛ, адбіраў у праваслаўных брацтваў іх цэрквы, школы, манастыры, непакорных яму праваслаўных святароў саджаў у турмы, галіў ім бароды і галовы, выганяў з прыходаў, падвяргаў катаванням [2, с. 192—194]. Падставай для такіх яго дзеянняў стала тое, што ў выніку заключэння Берасцейскай царкоўнай уніі Праваслаўная царква страціла статус самастойнай канфесіі, яе існаванне і дзейнасць ужо не мелі з фармальнага пункту гледжання законнай падставы.

Нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы, брацтвы паказалі неверагодную здольнасць да выжывання, перш за ўсё дзякуючы сваёй самаарганізацыі, непахіснасці і самадысцыпліне сваіх членаў.

Праваслаўным брацтвам быў уласцівы абшчынны ўклад жыцця на аснове ўнутранага самакіравання. Іх дзейнасць рэгулявалася статутамі, якія вызначалі мэты брацтваў, правілы дзейнасці і паводзін братчыкаў. Статуты зацвярджаліся каралямі Рэчы Паспалітай, якія выдавалі адпаведныя граматы на дзейнасць брацтваў, улічваючы важную ролю праваслаўнага элемента ў захаванні палітычнай стабільнасці ў дзяржаве.

Складаўся каталог (спіс) членаў брацтва, якія ўносілі пэўную колькасць грошай на яго рахунак. У брацкіх спісах былі людзі розных саслоўяў: святары, князі, шляхцічы, рамеснікі, гандляры, якія абавязваліся выконваць усе правілы, рашэнні, пастановы, захоўваць тайну.

Штогод са свайго асяроддзя братчыкі выбіралі асабліва сумленных членаў — старэйшын (старастаў) для штодзённага вядзення спраў брацтва: вырашэння спрэчак, расходавання грашовых сродкаў, пакарання за розныя правіннасці, адстойвання інтарэсаў брацтва перад свецкімі ўладамі.

Вышэйшай уладнай інстанцыяй брацтва з'яўляўся агульны сход яго членаў, які праходзіў у спецыяльна пабудаваным брацкім доме пры брацкай царкве.

Такі парадак арганізацыі брацтваў дазваляў арганічна спалучаць цэнтралісцкія і дэмакратычныя пачаткі ў іх дзейнасці з ухілам на свядомыя маральна-рэлігійныя паводзіны братчыкаў. Гэтыя паводзіны, безумоўна, вымагалі цвёрдай упэўненасці ў сваіх поглядах і актыў-

нага супрацьдзеяння антыправаслаўным настроям ва ўрадавых колах і значнай частцы грамадства. Яскрава такі духоўны настрой у дзейнасці брацтваў характарызуе пасланне львоўскага праваслаўнага епіскапа Балабана магілёўскім братчыкам ад 25 жніўня 1605 года. Ён пісаў: «Воин не во время мира и домашних занятий познается, но во время рати, а кормчий на море показывает свое искусство не во время тишины и благоприятного ветра, но во время бушевания морских и противных ветров, когда спасает себя самого и находящихся с ним в корабле. Так и вера и твёрдость истинных христиан обнаруживается во время восстания многих ненастий и соблазнов» [2, с. 215—216].

Менавіта дзякуючы цвёрдасці духу і рашучай практычнай дзейнасці брацтвы нярэдка дамагаліся аднаўлення правоў Праваслаўнай царквы, свабоды веравызнання, адкрыцця новых брацтваў, вяртання праваслаўных цэркваў ад уніятаў, будаўніцтва новых праваслаўных храмаў. Плёну ў гэтай справе да сэрэдзіны XVII стагоддзя ў многім паспрыяла ўкраінскае казацтва, якое выступіла за абарону праваслаўя з дапамогай зброі. Гэтая рашучая і ваяўнічая стыхія ўяўляла грозную для кіруючых колаў сілу, якая інстынктыўна разумела характар рэлігійна-палітычных узаемадачыненняў у феадальным грамадстве, адлюстраваных у формуле «Чыя ўлада — таго і вера». Таму сваю ваяўнічую дзейнасць казацтва ажыццяўляла пад сцягам барацьбы супраць феадальнай эксплуатацыі сялян і мяшчан, а таксама барацьбы супраць польскай-каталіцкай («ляшскай») веры дзеля абароны веры праваслаўнай. І трэба сказаць, што пад гэты сцяг гатовы былі стаць і станавіліся многія беларускія сяляне і мяшчане. Сумесна яны вялі антыфеадальную ўзброеную барацьбу, якая ў сярэдзіне XVII стагоддзя перарасла ў казацка-сялянскую вайну на Беларусі (1648—1651) і якая з цяжкасцю была падаўлена ўладамі ВКЛ.

Актыўная падтрымка ўкраінскім казацтвам праваслаўнай веры вымушала кіруючыя колы ВКЛ і ўвогуле Рэчы Паспалітай кіравацца абачлівымі падыходамі да дзейнасці праваслаўных брацтваў, каб не дапусціць глыбокага абвастрэння нацыянальна-рэлігійных супярэчнасцей, якія маглі б справакаваць чарговы сацыяльна-палітычны выбух у грамадстве з непрадказальнымі негатыўнымі наступствамі.

Яшчэ адным важнейшым чыннікам, які забяспечыў брацтвам росквіт і поспех іх дзейнасці да сярэдзіны XVII стагоддзя, была створаная імі сістэма асветы і адукацыі праваслаўнага насельніцтва. Асветніцкая дзейнасць спачатку не выходзіла за межы самаадукацыі братчыкаў, чытання свяшчэнных кніг, найперш Бібліі. Аднак паступова брацтвы пашыралі школьнае навучанне, бачачы ў ім сродак абароны ад каталіцкага і ўніяцкага наступу, бо толькі адукаваныя людзі могуць свядома і аргументавана адстойваць свае погляды і быць перакананымі ў іх правільнасці.

Гісторыя брацкіх гарадскіх праваслаўных школ пачалася ў 1584 годзе, калі віленскія мяшчане звярнуліся да свецкіх уладаў з просьбай дазволіць ім адкрыць школу «мовы грэчаскай, лацінскай і рускай, а таксама кнігадрукарню» [1, с. 213]. У 1592 годзе граматай караля Рэчы Паспалітай Жыгімонта III Вазы па просьбе мяшчан было заснавана Берасцейскае брацтва з правам адкрыцця школы для навучання дзяцей хрысціянскіх [3, с. 54].

Брацкія школы розных гарадоў падтрымлівалі ўзаемныя адносіны. Так, у Віленскую брацкую школу былі запрошаны настаўнікі з брацкай школы г. Бярэсця. У прыватнасці, у Віленскай школе адзін час працаваў настаўнік з Бярэсця Стэфан Зізаній, які «с пламенной ревностью возбуждал православных к защите своей веры» [1, с. 214]. За такія свае паводзіны ён неўзабаве быў выдалены з Вільні.

Брацтвы клапаціліся аб высокім прафесійным і маральным стане школьных настаўнікаў. У школьным статуце было запісана, што настаўнік школы «маеть быть благочестив, разумен, кроток, …не пьяница, не блудник, не лихоимец» [4, с. 39]. Настаўнік павінен быў аднолькава ставіцца да ўсіх вучняў, багатыя з іх не маглі нічым выдзяляцца, акрамя ведаў. У школы прымалі дзяцей з розных саслоўяў — шляхты, мяшчан і нават жабракоў. Галоўнае, каб гэта былі прадстаўнікі праваслаўнага юнацтва. Бацькі ўносілі грашовую плату за навучанне сваіх дзяцей, а неплацёжаздольныя вызваляліся ад платы. Адначасова бацькі заключалі з кіраўніцтвам

Репозиторий БарГУ

школы дамову наконт таго, чаму яна павінна навучыць іх дзяцей. Вучні жылі ў сваіх бацькоў, родзічаў, знаёмых, а некаторыя школы мелі свае інтэрнаты.

Да XVII стагоддзя падзелу школ на класы не існавала, вучні падзяляліся на некалькі груп у залежнасці ад узросту. У XVII стагоддзі пачала ўсталёўвацца класна-ўрочная сістэма заняткаў: 4—8 класаў. Навучальны год пачынаўся 1 верасня, прадугледжваліся летнія канікулы (ліпень—жнівень).

У сваіх асноўных рысах парадак навучання, які існаваў у брацкіх школах, захаваўся да нашага часу ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі: пачатак заняткаў раніцай, пераклічка вучняў, высвятленне прычын іх адсутнасці на занятках, праверка выканання і засваення хатняга задання, выкладанне новага матэрыялу і яго замацаванне.

Асноўная ўвага надавалася грунтоўнаму азнаямленню вучняў з веравучэннем Праваслаўнай царквы і навучанню мовам — польскай, царкоўнаславянскай і, што вельмі важна, беларускай. У склад школьных прадметаў таксама ўключаліся лацінская і грэчаская мовы, што давала магчымасць здольным вучням працягваць навучанне ў заходнееўрапейскіх універсітэтах і мець еўрапейскі ўзровень адукацыі.

У брацкіх школах таксама выкладаліся рыторыка і дыялектыка. Матэрыяльна забяспечаныя школы мелі магчымасць запрасіць на працу лепшых настаўнікаў, прапанаваць сваім вучням выкладанне ў поўным аб'ёме сямі вызваленых навук (граматыкі, дыялектыкі, рыторыкі, музыкі, арыфметыкі, геаметрыі, астраноміі). Пры гэтым асаблівая ўвага надавалася навуцы прамоўніцкага мастацтва — рыторыцы. Гэта было неабходна для паспяховага вядзення рэлігійнай палемікі з праціўнікамі праваслаўя з каталіцкага і ўніяцкага лагераў.

На ніве школьнай адукацыі праваслаўных брацтваў плённа працавалі бліскучыя педагогі — палемісты браты Лаўрэнцій і Стэфан Зізаніі, Лявонцій Карповіч, Мялецій Сматрыцкі, якія ўнеслі важкі ўклад ва ўмацаванне тэалагічнага падмурка праваслаўнай веры і яе абарону, выхаванне вялікай колькасці яе свядомых прыхільнікаў і абаронцаў. Для многіх з іх служэнне праваслаўю стала галоўнай сферай жыццёвых інтарэсаў і сэнсам усяго жыцця.

Кіравалі ўсімі справамі школ найбольш прыстойныя і адукаваныя братчыкі, якіх брацтвы вылучалі са свайго складу. Кожная школа мела свой статут, які рэгламентаваў парадак яе функцыянавання, правы і абавязкі настаўнікаў, а таксама патрабаванні да вучняў. Узначальваў школу рэктар, якога выбірала і наймала брацтва. Яно ж вызначала тэрмін яго працы і ўзровень яе аплаты. Звычайна рэктарам станавілася асоба духоўнага звання, якая валодала глыбокімі ведамі ў розных галінах навукі [1, с. 115].

Выхаваннем і навучаннем непасрэдна займаліся настаўнікі, якіх таксама наймала брацтва па ўзгадненні з рэктарам. Такім чынам, ахарактарызаваны вышэй парадак арганізацыі і дзейнасці брацкіх школ вызначаўся сваім дэмакратызмам, які прадугледжваў узгадненне інтарэсаў усіх зацікаўленых бакоў — брацтваў, выкладчыцкага складу, вучняў і іх бацькоў.

З другой паловы XVII стагоддзя праваслаўныя брацтвы паступова пачынаюць здаваць свае пазіцыі ў беларускім грамадстве. Гэтаму спрыялі ўнутрыпалітычныя і знешнія абставіны. Унутрыпалітычныя абставіны былі звязаны са здрадай праваслаўнай веры многіх магнацкіх родаў і шляхты, якія перайшлі ў каталіцтва і ўніяцтва, гвалтоўным насаджэннем уніяцкай веры сярод праваслаўнага насельніцтва тымі ж магнатамі, а таксама ўрадавымі коламі ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Не спрыялі праваслаўнай веры і знешнепалітычныя абставіны: узброены ціск на ВКЛ з боку праваслаўнай Маскоўска-Рускай дзяржавы, які знаходзіў маўклівае спачуванне, а нярэдка і непрыхаваную падтрымку беларускага праваслаўнага насельніцтва, на якую ўлады вымушаны былі рэагаваць абмежаваннем правоў праваслаўных вернікаў і іх галоўных заступнікаў — брацтваў. Напрыканцы XVIII стагоддзя каля 80 % беларусаў ужо сталі ўніятамі, такім чынам, уніяцтва стала іх нацыянальнай рэлігіяй. Яшчэ раней непрыкметна зышлі з гістарычнай сцэны праваслаўная брацтвы, страціўшы сацыяльную глебу свайго існавання.

Напрыканцы XVIII стагоддзя ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай беларускія землі з дапамогай вайсковай сілы былі далучаны да Расійскай імперыі і апынуліся пад яе прыгнё-

Рэпазіторый БарДУ

там. Цяпер ужо імперская Расія пачала гвалтоўна пераводзіць беларусаў-уніятаў у праваслаўную веру. У 1839 годзе на Полацкім царкоўным саборы была забаронена беларуская ўніяцкая царква (скасавана Берасцейская царкоўная унія 1596 года), а ўсе яе культавыя пабудовы і маёмасць былі перададзены Праваслаўнай царкве. Цяпер ужо праваслаўе карысталася абсалютнай падтрымкай з боку расійскага самаўладдзя і не мела ніякіх перашкод у сваім існаванні і панаванні. Становішча ўніяцтва і праваслаўя змянілася да адваротнага і не вымагала ад праваслаўных аднаўлення брацтваў для абароны сваіх інтарэсаў, якія былі ўжо поўнасцю забяспечаны і якім ўжо нішто не пагражала.

Аднак памяць пра унію і прыхільнасць да ўніяцкай веры ў свядомасці беларускага народа яшчэ захоўваліся і былі даволі трывалымі. Гэта яскрава пацвердзіла паўстанне 1863—1864 гадоў пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага супраць расійскага прыгнёту. Менавіта К. Каліноўскі вылучыў лозунг адраджэння ўніяцтва, якое лічыў нацыянальнай рэлігіяй беларусаў. У адным з нумароў заснаванай ім беларускамоўнай газеты «Мужыцкая праўда» ён пісаў, што цар маскоўскі «адабраў ад нас нашу справядлівую ўніяцкую веру і пагубіў нас перад Богам на векі; а зрабіў гэта для таго, каб мог нас без канца драці, а Бог справядлівы не меў зьлітавання над намі» [5, с. 17].

Ідэя адраджэння ўніяцкай веры прыцягнула на бок паўстання яе прыхільнікаў з ліку сялянства і ўніяцкага святарства. У паўстанні таксама прыняла ўдзел значная частка беларусаў-каталікоў і праваслаўных беларусаў, не задаволеных расійскім прыгнётам. Вось гэтая антырасійская, праўніяцкая і пракаталіцкая накіраванасць удзельнікаў паўстання прымусіла расійскі ўрад адрадзіць праваслаўныя брацтвы на беларускіх землях, каб з іх дапамогай аслабіць пазіцыі Рымска-каталіцкай царквы і прадухіліць апалячванне насельніцтва Паўночна-Заходняга краю, як у тыя часы расійскія ўлады называлі Беларусь [6, с. 55]. Адначасова ў беларусаў знішчалася памяць пра унію, ствараліся ўмовы для іх выхавання ў расійскім імперска-вялікадзяржаўным духу.

У 1867 годзе ў Паўночна-Заходнім краі ўжо мелася 187 брацтваў [7, с. 10]. Ставілася задача, каб яны існавалі ў кожным прыходзе. Членам брацтва мог быць любы паўналетні праваслаўнага веравызнання, які пражываў у Расійскай імперыі [8, с. 11]. Такім чынам, членамі брацтваў часта станавіліся служыўшыя на Беларусі рускія чыноўнікі, святары, дактары, інжынеры, настаўнікі школ і гімназій, афіцэры расійскай арміі, прадстаўнікі іншых прафесій. Гэта таксама спрыяла русіфікацыі беларускага краю.

Брацтвы вялі барацьбу з рэлігійнымі іншаверствамі, у прыватнасці, з іудаізмам. Дзеля гэтага яны, напрыклад, вялі публічныя сумоўі з мясцовым яўрэйствам «о заблуждениях талмудического учения и о непреложной истинности христианского православного вероучения» [9, с. 2].

Традыцыйна яны займаліся і хрысціянска-дабрачыннай, а таксама культурна-асветніцкай дзейнасцю: дапамагалі бедным, хворым і знявечаным хрысціянам праваслаўнага веравызнання, сіротам, ажыццяўлялі бібліятэчную і выдавецкую дзейнасць, арганізоўвалі правядзенне святаў, прапагандавалі цвярозы вобраз жыцця і інш. Вялікую ўвагу яны таксама надавалі адкрыццю і арганізацыі школ, у якія ўжо прымалі і дзяўчынак.

Брацкія школы рыхтавалі для царкоўна-прыходскіх школ народных настаўнікаў з самога народнага асяроддзя, надаючы ім адукацыю ў строгім духу Праваслаўнай царквы [10, с. 19]. Тэрмін навучання ў брацкіх школах складаў тры гады. Першыя два гады адукацыя ажыццяўлялася ў самой школе, а трэці год адводзіўся на практычнае азнаямленне з будучым настаўніцтвам у пачатковых школах. Пералік вывучаемых прадметаў уключаў у сябе: Закон Божы (3 урокі ў тыдзень), арыфметыку і пачатковую геаметрыю (4 урокі), геаграфію з прыродазнаўствам (2 урокі), чыстапісанне (2 урокі), рускую мову (6 урокаў). Усё навучанне вялося на рускай мове, акрамя Закона Божага, які выкладаўся на царкоўнаславянскай мове. У прамежках паміж урокамі вучні займаліся розным штукарствам у школьнай майстэрні, а пасля абеду — царкоўнымі спевамі [10, с. 24].

Рэпазіторый БарДУ

Мэты, якія ставіліся перад аднаўленымі брацтвамі, спакваля дасягаліся. Але іх дзейнасць была спынена ў выніку бальшавіцкай рэвалюцыі ў кастрычніку 1917 года. Сёння яны на Беларусі зноў адраджаюцца, па-ранейшаму займаюцца падтрымкай праваслаўнай веры, рэлігійна-асветніцкай і дабрачыннай дзейнасцю. Але ўся гэтая дзейнасць адбываецца ва ўмовах поліканфесійнай структуры беларускага грамадства, рэлігійнай талерантнасці і свабоды веравызнання, раўнапраўя канфесій, аддзялення Царквы ад дзяржавы і школы ад Царквы, у выніку чаго Царква пазбавілася функцый адукацыі і выхавання народа, перастала быць афіцыйным інструментам дзяржаўнай палітыкі. Такая сітуацыя вымагае дзейнасці Праваслаўнай царквы і яе брацтваў ва ўмовах свабоднай канкурэнцыі, суперніцтва за ўплыў у грамадстве з іншымі канфесіямі, найперш з рымска-каталіцкай канфесіяй.

**Заключэнне.** Праведзены аналіз мэтаў і накірункаў дзейнасці праваслаўных брацтваў на Беларусі ў XVI — пачатку XX стагоддзя дазваляе зрабіць наступныя абагульненні.

Брацтвы, як нацыянальна-рэлігійныя аб’яднанні праваслаўнага насельніцтва ВКЛ, на першым этапе свайго існавання пераважна займаліся дабрачыннай дзейнасцю, у аснове якой ляжалі ўласцівыя хрысціянству ідэі міласэрнасці і чалавекалюбства.

У сувязі з каталіцка-езуіцкім наступам і ўвядзеннем у ВКЛ уніяцкай веры брацтвы напрыканцы XVI стагоддзя галоўную ўвагу пачынаюць надаваць абароне праваслаўнай веры, якая адыграла важную ролю ў прадухіленні дэнацыяналізацыі беларускага народа. Галоўным чыннікам у гэтай справе стала адукацыйная дзейнасць праваслаўных брацтваў.

Аднаўленне брацтваў у апошняй трэці XIX стагоддзя тлумачыцца перш за ўсё імкненнем расійскага ўрада нейтралізаваць польскі палітычны і каталіцкі ўплыў на Беларусі, знішчыць у беларусаў памяць пра унію і тым самым забяспечыць дамінаванне на беларускіх землях тых формаў грамадскага і духоўнага жыцця, якія былі ўласцівы Расійскай імперыі.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. Беларусы. Грамадскія традыцыі / В. Ф. Бацяеў [і інш.] ; рэдкал.: В. М. Бялявіна [і інш.] ; Ун-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. — Мінск : Беларус. навука, 2002. — Т. 6. — 606 с.

2. Белоруссия и Литва. Исторические судьбы Северо-Западного края. Издано П. Н. Батюшковым. — СПб. : Тип. товарищества «Общественная польза», 1890. — 376 с.

3. *Криштапович, Л. Е.* Беларусь и Россия: историческое и цивилизационное единство : монография / Л. Е. Криштапович. — Минск : Акад. упр. при Президенте Респ. Беларусь, 2006. — 94 с.

4. *Таляронак, С. В.* Брацкія праваслаўныя школы на Беларусі ў XVI—XVII стст. / С. В. Таляронак // Пачатк. шк. — 1992. — № 3. — С. 38—40.

5. *Янушкевіч, Я.* Тварам да шыбеніцы: Кастусь Каліноўскі і Паўстанне 1863—1864 гадоў у беларускай паэзіі : анталогія / Я. Янушкевіч. — Ракаў, 2013. — 137 с.

6. *Восович, С. М.* Православные братства Витебщины и их культурно-просветительская деятельность в 1861—1914 гг. : монография / С. М. Восович. — Брест : Изд-во БрГТУ, 2009. — 200 с.

7. *Миловидов, А.* Западнорусские православные братства, их современное значение и задачи / А. Миловидов. — Вильна : Рус. Почин, 1912. — 36 с.

8. *Восович, С. М.* Культурно-просветительская деятельность Брестского Свято-Николаевского братства во второй половине XIX — начале XX века / С. М. Восович // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. гуманітар. і грамад. навук. — 2007. — № 4 (31). — С. 10—16.

9. Устав Мстиславского отделения Могилевского церковного Богоявленского Братства. — Тип. Могилев. Губерн. правления, 1898. — 11 с.

10. Отчет совета церковного братства во имя святителя Николая и преподобной Ефросинии, княжны Полоцкой в г. Полоцке. — Витебск, 1868. — 53 с.

Паступіў у рэдакцыю 09.03.2022.

Репозиторий БарГУ